# ГІСТОРЫЯ

УДК 94(476) «1941/1945» (512.145)

***С.У. Грыбава***

## УДЗЕЛ БЕЛАРУСКІХ ТАТАР У ПАДПОЛЬНЫМ РУХУ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

У дадзеным артыкуле аналізуецца інфармацыя аб дзейнасці беларускіх татар падчас Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі ў складзе падпольных антыфашысцкіх арганізацый, якая атрымала афіцыйнае прызнанне ў пасляваенныя гады. Большасць матэрыялу прысвечана барацьбе мясцовых татар у мінскім падполлі (у складзе такіх разведвальна-дыверсійных груп, як «Мсціўцы», «Першыя», у падпольнай групе на гарбарным заводзе «Бальшавік», групе ў складзе цэлай татарскай сям'і Адамовічаў). У артыкуле таксама разглядаецца дзейнасць татар, ураджэнцаў Беларусі, ва ўздзенскім падполлі. Матэрыял у асноўным грунтуецца на дадзеных Нацыянальнага архіва РБ і ўспамінах удзельнікаў ВАВ. Трэба адзначыць каштоўнасць змешчаных у артыкуле звеста у сувязі з тым, што большасць з іх актуалізуецца і ўводзіцца ў навуковы ўжытак упершыню.

### Уводзіны

У гераічны летапіс барацьбы супраць фашызму яскравую старонку ўпісалі і падпольшчыкі. Безумоўна, нельга пераацаніць значнасць падполля ў перамозе над нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У складзе яго членаў вялі барацьбу з ворагам і беларускія татары. Мэтай дадзенага артыкула з’яўляецца аналіз іх дзейнасці ў антыфашысцкай барацьбе ў межах падпольнага руху на тэрыторыі Беларусі падчас Вялікай Айчыннай вайны.

Шмат высакародных і самаадданых учынкаў было здзейснена татарамі Беларусі ў складзе мінскага падполля. Звяртае на сябе ўвагу постаць Александровіча Хасана Мустафавіча, мінскага татарына, удзельніка падполля з лістапада 1941 г. па лістапад 1942 г. Ён з чэрвеня 1942 г. быў наборшчыкам лістовак і газеты «Звязда» другога, трэцяга, чацвёртага і пятага нумароў у акупаваным Мінску. Апошні нумар, на жаль, не выйшаў з прычыны масавых арыштаў падпольшчыкаў. Яго дзейнасці ў пэўнай ступені надаецца ўвага ў беларускай гістарычнай навуцы (Э. Іофе, І. Канапацкі, С. Грыбава) [1, с. 131–136; 2, с. 273–278; 3, с. 22–25]. У дадзеным артыкуле мы спынімся на малавядомых фактах барацьбы татарскага насельніцтва Беларусі ў падпольным руху.

### Уклад беларускіх татар у перамогу над ворагам у складзе мінскага падполля

Трэба падкрэсліць актыўнасць барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі падпольнай групы ў складзе цэлай татарскай **сям’і Адамовічаў** (прызнана Пастановай бюро Мінскага ГК КПБ ад 26 кастрычніка 1983 г.), якая дзейнічала ў Мінску з верасня 1941 г. па 25 сакавіка 1942 г. У склад групы ўваходзілі: **Адамовіч Ібрагім Аляксандравіч (кіраўнік),** яго сястра – Адамовіч Алена Аляксандраўна, бацька – Аляксандр Ібрагімавіч – і маці – Марыя Іванаўна.

---

Навуковы кіраўнік – Г.Я. Галенчанка, доктар гістарычных навук, галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі, прафесар кафедры гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы

Адамовіч Ібрагім Аляксандравіч (1917 года нараджэння) меў вышэйшую адукацыю, у 1941 г. скончыў політэхнічны інстытут у Мінску, быў членам ВЛКСМ. Яго бацька, Адамовіч Аляксандр Ібрагімавіч (1884 г.н.), меў сярэднюю адукацыю, да вайны працаваў галоўным бухгалтарам на прамысловым прадпрыемстве. Маці, Адамовіч Марыя Іванаўна (1888 г.н.), таксама мела сярэднюю адукацыю, працавала тавараведам. Сястра, Алена Аляксандраўна (1921 г.н.), скончыла першы курс Мінскага політэхнічнага інстытута. Да вайны сям'я жыла ў Мінску па вуліцы Чычэрына, д. 31, аднак пры першай жа бамбардзіроўцы гітлераўцаў дом згарэў, і пасля няўдалай спробы выйсці з горада яны перасяліліся да свайго знаемага яўрэя (яго хутка немцы забралі ў гета) на Пугачоўскі завулак, 12 [4, л. 34]. З першых дзён акупацыі члены сям'і аказвалі дапамогу воінам Чырвонай Арміі, якія збеглі з лагераў ваеннапалонных ці не выйшлі з варожага акружэння. Хавалі іх у сваёй кватэры, забяспечвалі вопраткай, дакументамі, часова ўладкоўвалі на працу. Некаторыя з іх, атрымаўшы неабходныя дакументы, тапаграфічныя карты, пасля выходзілі з Мінска, далучаліся да партызанскіх атрадаў або былі ініцыятарамі іх стварэння (Д.І. Копанеў – начальнік штаба партызанскай брыгады «Народныя мсціўцы» імя В.Т. Варанянскага, А.Ф. Сакалоў – камандзір атрада «Мсцівец» брыгады «Народныя мсціўцы» імя В.Т. Варанянскага, І.І. Мураўёў і інш.) [4, л. 8].

Ініцыятарам шматлікіх рызыкоўных спраў быў Адамовіч Ібрагім. Выкарыстоўваючы свае прыродныя задаткі, ён з поспехам падрабляў пячаткі акупацыйных устаноў і подпісы начальнікаў на пашпартах, пропусках і іншых дакументах. Аднаму з першых ён зрабіў дакументы Леаніду Леаненку [4, лл. 7–8, 34]. Аб здольнасцях Ібрагіма Адамовіча сведчаць у сваіх успамінах падпольшчыцы Л.Д. Драгун і В.А. Салаўянчык, якія па заданні падпольшчыкаў уладкаваліся на працу ў Заявачнае бюро. Адтуль яны выкрадалі чыстыя бланкі пашпартоў, запаўнялі іх, а подпісы падрабляў Ібрагім Адамовіч (у падполлі «Боб») [5, л. 19; 6, л. 3].

Менавіта ў кватэры Адамовічаў па Пугачоўскім завулку, 12 неаднаразова збіраўся штаб падпольнай арганізацыі "Ваенны Савет партызанскага руху" (ВСПР). Гэтая арганізацыя ўзнікла ў верасні 1941 г. (дзейнічала да сакавіка 1942 г.) і ставіла сваёй мэтай агульнае кіраўніцтва партызанскім рухам у наваколлі Мінска пры супрацоўніцтве з падпольным ГК КП(б)Б [7, с. 37]. У штаб-кватэры абмяркоўваліся планы барацьбы з фашысцкімі захопнікамі, праходзілі сустрэчы падпольшчыкаў з сувязнымі партызанскіх атрадаў і груп. У кватэры Адамовічаў хаваўся начальнік штаба ВСПР І.М. Бялоў, які далучыў да падпольнай дзейнасці арганізацыі ўсю сям'ю. Адамовічы выконвалі даручэнні ВСПР, наведвалі ўдзельнікаў падполля ў іншых месцах горада, перадавалі ім неабходную інфармацыю і ўказанні. У іх былі сувязі з чыгуначным вузлом, дзе працаваў сябар Ібрагіма Адамовіча Мікола Вялічка («Малый»), з падпольнай групай палітэхнічнага інстытута праз студэнта 3 курса С. Аўхіменя [4, лл. 7, 35]. З успамінаў Алены Адамовіч (у падполлі Галі) можна даведацца: «…из подпольных штабных квартир я знала квартиру в Серебрянке по ул. Надежденской, 14а, где жила Лидия Драгун, квартиру по ул. Берсона, 3, куда часто ходил брат, так как там жили машинистки, которые печатали приказы штаба ВСПД. …квартиру Вороновых, по ул. Шорной, 9, которую мы с мамой часто посещали по заданию брата, …и квартиру по ул. Проводной, 24. Знала, што на Комаровке тоже есть штабная квартира, но никогда там не была, с ней был связан мой брат» [4, лл. 34–35].

У кватэры Адамовічаў захоўваліся здабытыя зброя і медыкаменты. Тут жа друкавалі на пішучай машынцы антыфашысцкія лістоўкі, якія потым распаўсюджвалі па горадзе. Алена Ібрагімаўна Адамовіч ўспамінае: «По приказанию штаба меня устроили в торговый отдел. Я доставала бумагу для листовок, копирку, ленту для печати. Удалось достать неисправную печатную машинку, которую брат починил. На ней мы с мамой и печатали воззвания к полицаям, чтобы они переходили к

партизанам, обращения к народу, что гитлеровцы – это наш заклятый враг и что они никогда не победят. … В торговом отделе получали продукты немцы, полицаи. Часто шли разговоры о их планах. Нас они не считали за людей. Так я узнала о готовящихся погромах в гетто. У меня там была подруга Ф. Танхилевич, через которую я предупредила о намерениях фашистов. Доставала продукты для скрывающихся военных у нас» [4, л. 35].

Маці, Адамовіч Марыя Іванаўна, добра ведала замежныя мовы: нямецкую, літоўскую, французскую, польскую. Яна выкарыстоўвала свае веды на карысць падполля. Кожны раз, знаходзячы новую прычыну, даставала ў немцаў медыкаменты. Прыслухоўваючыся да размоў немцаў, даведвалася аб іх планах, здабывала карысную інфармацыю. Алена Адамовіч успамінае і такі выпадак: «Однажды наш район окружили немцы и начали производить повальные обыски. Кругом стояли литовцы (паліцэйскія 12-га літоўскага паліцэйскага батальёна. – аўт.) и смотрели, чтобы никто не вышел из района оцепления. У нас находился человек, которому брат должен был сделать документы. Дома были я, брат, мама и бабушка. Надо было уходить. Мама вышла с нами и на литовском языке заговорила с литовцами. Они нас пропустили. Так мы спаслись, благодаря маме» [4, л. 37].

Бацька Ібрагіма і Алены, Адамовіч Аляксандр Ібрагімавіч, пачаў працаваць на фабрыцы-кухні, дзе ў гады вайны была сталовая БНС. Дзякуючы Аляксандру Ібрагімавічу, пэўны час на фабрыцы-кухні працавалі І.М. Бялоў (начальнік штаба ВСПР), І.І. Рогаў (старшыня ВСПР, член ГК КП(б)Б) і многія іншыя.

Трэба адзначыць, што ў кіраўніцтва ВСПР сям’я карысталася асаблівай павагай і даверам. Аб гэтым сведчыць і той факт, што загадам ВСПР ад 1 кастрычніка 1941 г. Адамовіч Аляксандр (у падполлі «Алебовіч») і Адамовіч Ібрагім былі прызначаны камандзірамі будучых партызанскіх атрадаў і груп [4, л. 27].

Аднак дзейнасць падпольшчыкаў была выкрыта немцамі. 25 сакавіка 1942 г. кіраўніка групы Адамовіча Ібрагіма арыштавалі ў штаб-кватэры па Берсана, 3 (за дзень да запланаванага адыходу ў партызанскі атрад). Астатніх членаў сям’і гестапаўцы забралі ў кватэры па Пугачоўскім завулку, 12. Аб гэтых трагічных падзеях у сваіх успамінах Алена Адамовіч (па мужу Томах) у 1983 г. пісала: «Поздно вечером к нам в картиру ворвались гестаповцы и выгнали всех во двор. Начали обыск. Только не тронули бабушку, которая успела сесть на бланки, паспорта, приказы, хранившиеся у нее под матрасом. … Нас привезли в гестапо, где мы увидели брата и много других людей, среди которых были и подпольщики. Нас поставили лицом к стене. …Нас допрашивали, не имея улик. Маму с папой отпустили, а меня, брата, мужа и других незнакомых людей повели в тюрьму на ул. Володарского. После допросов через несколько дней меня и мужа отпустили. В управе на выдаче паспортов сидели друг Севы Авхименя и мой знакомый Александр Магилевчик. Они срочно выписали нам поддельные паспорта, и мы с мужем выехали в г. Новогрудок, на родину отца. Мать и отец ушли на другую квартиру и стали искать возможность узнать что-нибудь о брате. Им удалось через подпольщиков наладить с ним переписку. … В последнем письме брат написал, что его судьба предрешена, о нем в гестапо все известно…» [4, лл. 38–39].

У нямецкіх дакументах-справаздачах наконт арыштаў мінскіх падпольшчыкаў вясной 1942 г. паведамлялася, што гітлераўцамі было захоплена 404 чалавекі, 251 з іх расстраляны. Таксама адзначалася, што 7 мая 1942 г. у Мінску былі публічна пакараны смерцю яшчэ 28 чалавек [7, с. 40]. Як сведчаць удзельнікі мінскага падполля, гэты ж час пасля допытаў, на працягу якіх праявіў мужнасць і нікога не выдаў, быў павешаны і Адамовіч Ібрагім Аляксандравіч [8, л. 31; 4, лл. 9, 40].

Астатнія члены сям’і, бацька Адамовіч Аляксандр Ібрагімавіч, і маці Марыя Іванаўна, пасля гібелі сына пераехалі ў Навагрудак. Пэўны час сям’я Адамовічаў была

вымушана хавацца ў партызанскай зоне [4, л. 40]. А.І. Адамовіч памёр у 1944 г. Адамовіч Марыя Іванаўна пасля вайны працавала ў Мінску бухгалтарам (памерла ў 1978 г.), іх дачка, Алена Ібрагімаўна, скончыла будаўнічы факультэт Беларускага політэхнічнага інстытута, працавала па спецыяльнасці [4, л. 10–11].

Такім чынам, відавочна, што цэлая сям'я мясцовых татар Адамовічаў з'яўляецца яскравым прыкладам актыўных самаадданых барацьбітоў супраць фашызму на беларускай зямлі.

Пастановай бюро Мінскага гаркама КПБ ад 30 студзеня 1985 года (пратакол № 18, § 12) «Аб прызнанні дзейнасці падпольнай патрыятычнай групы на гарбарным заводзе «Бальшавік» у час Вялікай Айчыннай вайны 1941–45 гг.» была прызнана дзейнасць падпольшчыкаў на гарбарным заводзе [9, л. 1]. Група дзейнічала са жніўня 1941 г. па ліпень 1944 г. [10, с. 208]. У складзе ўдзельнікаў групы значацца 15 чалавек, у тым ліку татарын **Канапацкі Якаў Мацвеевіч** (1913 г.н.), які быў яе членам са жніўня 1941 г. па сакавік 1944 г., і яго сястра **Канапацкая** (па мужу Малаковіч) **Роза Мацвееўна** (1911 г.н.), член групы са снежня 1942 г. па сакавік 1944 г. [9, л. 1]. Асноўная дзейнасць падпольшчыкаў зводзілася да выкрадання з завода выробленых скур, хімікатаў, медыкаментаў, солі і перадачы іх праз сувязных партызанам. Таксама падпольшчыкі распаўсюджвалі на заводзе лістоўкі, газету «Звязда». Яны падтрымлівалі цесную сувязь з камандаваннем партызанскай брыгады «Народныя мсціўцы» імя В.Т. Варанянскага і атрадаў «Мсцівец», імя А.В. Суворава, імя І.Г. Катоўскага Мінскай вобласці, выконвалі іх заданні [9, л. 1].

Канапацкі Якаў Мацвеевіч пачаў працаваць на заводзе «Бальшавік» у 1932 г. стрцгальшчыкам. Пасля акупацыі г. Мінска ў 1941 г. працягваў сваю працу на гэтым жа заводзе, бо з горада выйсці не паспеў, а ў Чырвоную Армію не змог трапіць па стане здароўя [9, л. 59]. Першапачаткова ў жніўні 1941 г. падпольная група стварылася ў складзе У.Ф. Гаеўскага (кіраўнік групы), Я.М. Канапацкага (намеснік кіраўніка групы), Р.І. Наркевіч, Ф.І. Гаеўскага. Працу групы накіроўвала член ВКП(б) В.Ф. Мацюшка, якая давала парады Гаеўскаму і Канапацкаму па арганізацыі работы групы, а таксама канкрэтныя заданні [9, л. 11]. В.Ф. Мацюшка з моманту стварэння падпольных раённых камітэтаў г. Мінска (май 1942 г.) выконвала функцыі намесніка сакратара падпольнага Варашылаўскага РК КП(б)Б. На пасяджэнні камісіі КП(б)Б, прысвечанаму мінскаму патрыятычнаму падполлю, 28 мая 1958 г. В.Ф. Мацюшка паведаміла: «На кожзаводе «Большевик», который не входил в мою зону, но мне было поручено доставать в отряд кожтовары, я связалась с В. Гаевским, Я. Конопацким, Р. Наркевич. Вот через этих трех комсомольцев я организовала работу. Они сколько могли выносили кожтовары, накапливали их по ул. Белорусской. Затем туда приходил из отряда Е. Волостных (камісар атрада імя Г.І. Катоўскага брыгады «Народныя мсціўцы» імя В.Т. Варанянскага. – аўт.) и кожтовары забирал в отряд. И даже когда я ушла, Волостных с этой группой обеспечивал партизанские отряды этими товарами» [11, л. 79].

Канапацкі Якаў Мацвеевіч стаяў ля вытокаў стварэння патрыятычнай групы на гарбарным заводзе і быў адным з актыўных яго ўдзельнікаў. Аднак у сакавіку 1944 г. дзейнасць падпольшчыкаў была выкрыта немцамі. Па падазрэнні ў сувязях з партызанамі разам з некаторымі іншымі членамі групы былі арыштаваны Канапацкі Якаў Мацвеевіч і яго сястра Роза Мацвееўна. Яны мужна трымаліся на допытах, нікога не выдалі і ні ў чым не прызналіся [9, л. 17]. Роза Мацвееўна ў сакавіку 1944 г. была вывезена немцамі на працу ў Германію, Якаў Мацвеевіч – у канцэнтрацыйны лагер у Францыю [9, л. 60]. У канцы вайны ён апынуўся ў амерыканскай зоне акупацыі і ў 1945 г. вярнуўся на Радзіму. Жыў і працаваў у Мінску. Я.М. Канапацкі за свой уклад у перамогу над агульным ворагам атрымаў наступныя медалі: «За баявыя заслугі», «Партызану Айчыннай вайны» 1-й і 2-й ступеней, «30 гадоў Узброеных Сіл СССР» [9, л. 25].

Нягледзячы на тэрор акупантаў у дачыненні да мінскіх падпольшчыкаў на працягу 1943–1944 гг., у горадзе ўзнікаюць новыя падпольныя групы. У складзе мінскага падполля, а менавіта ў спісе сувязных разведвальна-дыверсійнай групы «Мсціўцы» (кіраўнік С.В. Юрын), якая дзейнічала з ліпеня 1943 г. па ліпень 1944 г. у г. Мінску і суседніх раёнах, значыцца татарын **Мейшутовіч Адам Сулейманавіч** (1915 г.н.). Да вайны ён працаваў сталяром на будаўніцтве авіязавода. Сувязным группы А.С. Мейшутовіч быў з 22 студзеня 1944 г. Ён садзейнічаў выяўленню здраднікаў радзімы і нямецкіх памагатых [12, л. 8].

Татарка **Байрашэўская Марыя Канстанцінаўна** з 8 чэрвеня 1943 г. па 1 ліпеня 1944 г. выконвала функцыі сувязной падпольнай разведвальна-дыверсійнай групы «Першыя» (кіраўнік В.І. Жукаў), якая дзейнічала з 27 сакавіка 1943 г. па 1 ліпеня 1944 г. у г. Мінску, а таксама ў Смалявіцкім, Барысаўскім, Пухавіцкім і Чэрвеньскім раёнах Мінскай вобласці. Яна праводзіла работу па выяўленні здраднікаў Радзімы, кіраўнікоў пранямецкай БНС [13, лл. 1–2]. За сваю дзейнасць у барацьбе з ворагам М.К. Байрашэўская была ўзнагароджана медалём «Партызану Айчыннай вайны» 2-й ступені [14, л. 21а].

У барацьбе з ворагам таксама ўдзельнічала **Якубоўская** (Нікалайчык) **Таісія Якаўлеўна** 1927 года нараджэння, якая жыла ў Мінску па вул. Саўгаснай, д. 11 (непадалек ад Татарскай вуліцы, дзе размяшчалася мячэць). У 1940 г. памерлі яе бацькі, апекуном стаў брат маці – Александровіч Асан, які 24 чэрвеня 1941 г. пайшоў на фронт і загінуў у першыя дні вайны. Яна засталася адна. Як успамінае сама Т.Я. Якубоўская, з лістапада 1942 г. яна ўваходзіла ў склад падпольнай групы, якой кіравала Р.П. Духоўнікава (член мінскага падполля, сувязная партызанскага атрада «За радзіму» брыгады імя М.В. Фрунзе Вілейскай вобласці з верасня 1941 г. па ліпень 1944 г. – аўт.), якая жыла па суседстве і садзейнічала далучэнню Таісіі Якубоўскай да падпольнай працы. У маі 1943 г. члены групы арганізавалі ўцёкі 20-і ваеннапалонных і пераправілі іх у партызанскі атрад «За радзіму». З атрада атрымлівалі лістоўкі і зводкі інфармбюро, якія потым распаўсюджвалі [15, с. 63]. Таісія Якаўлеўна здабывала і перапраўляла партызанам зброю, медыкаменты, боепрыпасы, соль і іншыя неабходныя рэчы. Кватэра Таісіі Якубоўскай была явачнай для падпольшчыкаў і партызан, якія накіроўваліся ў Мінск па заданні. Дарэчы, Т.Я. Якубоўская была афіцыйна прызнана ў пасляваенныя гады сувязной атрада «За Радзіму» брыгады імя М.В. Фрунзе Вілейскай вобласці (з 15 лістапада 1942 г. па 3 ліпеня 1944 г.) [16, л.10, 14].

**Антыфашысцкая барацьба беларускіх татар у складзе ўздзенскага падполля**

Свой уклад у перамогу над ворагам прынеслі і падпольшчыкі з г. Узда Мінскай вобласці. Уздзенская раённая камісія па ўвекавечванні гераічных подзвігаў савецкіх людзей у гады ВАВ пасля вывучэння ўсіх неабходных матэрыялаў прызнала дзейнасць Уздзенскага патрыятычнага антыфашысцкага падполля і ў Пастанове ад 21 жніўня 1968 г. звярнулася з просьбай да РК КПБ аб зацвярджэнні спіса яго членаў. Станоўчае рашэнне райкам КПБ прыняў 3 верасня 1968 г. Сярод членаў уздзенскага падполля значыцца татарын **Александровіч Адам Якаўлевіч** (1923 г.н.). Да вайны – студэнт БДУ, член ВЛКСМ. Падчас акупацыі ен працаваў настаўнікам у Магільнянскай школе Узденскага раёна, потым меў дачыненне да выпіскі пашпартоў, працуючы ў Целякоўскай валасной управе, чым значна дапамагаў падпольшчыкам і партызанам. Членам уздзенскага падполля А.Я. Александровіч лічыцца з лістапада 1942 г. па ліпень 1944 г. У гэты час ён вёў актыўную і разнастайную дзейнасць у барацьбе з ворагам. А.Я. Александровіч праводзіў сярод насельніцтва мястэчка працу, накіраваную на зрыў планаў немцаў. Ён садзейнічаў расклейванню лістовак ва ўздзенскім нямецкім

гарнізоне, перадаючы іх надзейным людзям. Падкідваў лістоўкі ў калідоры нямецкай управы, паблізу паліцэйскіх пастоў [17, лл. 2, 13, 161]. Распаўсюджваў сярод насельніцтва пры дапамозе арганізаванай ім групы атрыманую з РК КП(б)Б савецкую літаратуру. Адам Якаўлевіч з'яўляўся сакратаром падпольнай камсамольскай арганізацыі. Адначасова ён выконваў функцыі сувязнога партызанскага атрада «Патрыёт Радзімы» 300-й брыгады імя К.Я. Варашылава Мінскай вобласці. А.Я. Александровіч збіраў і перадаваў партызанам звесткі дзейнасці пранямецкага СБМ, а таксама аб нямецкім гарнізоне, аб яго колькасным стане, узбраенні, аб тых мерапрыемствах, якія праводзілі немцы па ваеннаму ўмацаванню м. Узда [18, лл. 9–10;19, л. 20]. Ён таксама забяспечваў партызан паперай і стужкамі для пішучых машынак [17, л. 13]. Усе даручэнні камандавання выконваў своечасова і дакладна. У 1944 г. быў прызваны Уздзенскім РВК у Чырвоную Армію для далейшай барацьбы з фашызмам. Змагаўся ў складзе 2-га і 3-га Беларускіх франтоў [18, л. 9]. Падчас ваенных дзеянняў два разы быў паранены. Пасля вайны вярнуўся на радзіму. За ўклад у агульную перамогу над ворагам А.Я. Александровіч атрымаў наступныя медалі: «За адвагу», «За ўзяцце Кёнігсберга» і інш. [17, л. 161].

У спісе членаў антыфашысцкага ўздзенскага падполля значыцца і прозвішча татаркі **Раецкай Эміліі Аляксандраўны**. Нарадзілася яна ў 1917 г. у г. Узда. Беспартыйная, мела сярэднюю медыцынскую адукацыю. У падполлі Эмілія Аляксандраўна змагалася з ліпеня 1941 г. па ліпень 1944 г. [17, л. 108]. Да вайны і падчас акупацыі яна працавала ва ўздзенскай раённай бальніцы. З першых дзён вайны Э.А. Раецкая прыкладала шмат намаганняў па выратаванні параненых камандзіраў і байцоў Чырвонай Арміі, якія паступалі ва ўздзенскую бальніцу. Пасля заняцця гітлераўскімі войскамі Узды яна разам з іншым медперсаналам бальніцы хавала зброю, абмундзіраванне і боепрыпасы чырвонаармейцаў, якія лячыліся ў бальніцы, што выратоўвала іх ад арыштаў. Пасля загойвання ран байцы і камандзіры накіроўваліся ў партызанскія атрады. У лютым 1942 г. Мінскім падпольным ГК КП(б)Б было прынята рашэнне аб аб'яднанні невялікіх партызанскіх груп, штодзейнічалі на Уздзеншчыне, у партызанскі атрад, камандзірам якога быў прызначаны М.М. Нікіцін. Уздзенскія падпольшчыкі актыўна ўключыліся ў арганізацыю атрада. Э.А. Раецкая і Т.Г. Зайцава дасталі абсталяванне для стаматалагічнага кабінета, якое было перапраўлена ў атрад для партызанскага шпіталя [7, с. 115, 117]. Э.А. Раецкая передала партызанам шмат медыкаментаў, перавязачных матэрыялаў, хірургічных інструментаў (з 10 кастрычніка 1943 г. яна лічыцца ў спісах сувязных партызанскага атрада імя Р.І. Катоўскага 300-й брыгады імя К.Я. Варашылава Мінскай вобласці), а таксама зброю і боепрыпасы. Яна даставала пісчую паперу і стужкі для пішучых машынак. За ўклад у перамогу над ворагам Э.А. Раецкая была ўзнагароджана медалем «Партызану Айчыннай вайны» 2-й ступені. Пасля вайны яна жыла ў Мінску [17, л. 108].

**Заключэнне**

З прыведзеных дадзеных становіцца відавочным, што прадстаўнікі татарскага насельніцтва Беларусі не былі ўбаку падчас барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Яны змагаліся і ў складзе падполля, свядома ідучы на рызыку, не шкадуючы ўласнага жыцця. Большасць з іх была прадстаўлена ў мінскіх падпольных антыфашысцкіх арганізацыях. Падпольная дзейнасць беларускіх татар супраць ворага атрымала афіцыйнае прызнанне ў пасляваенныя гады. Трэба адзначыць каштоўнасць сабраных намі матэрыялаў у сувязі з тым, што большасць з іх актуалізуецца і ўводзіцца ў навуковы ўжытак упершыню.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Иоффе, Э. К вопросу об участии татар в Великой Отечественной войне на территории Беларуси / Э. Иоффе // Ісламская культура татараў-мусульман Беларусі, Літвы і Польшчы і яе ўзаемадзеянне з беларускай і іншымі культурамі : матэрыялы другой міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 19–20 мая 1995 г. : у 2 ч. / Бел. дзярж. пед. ун-т ; рэдкал.: І. Канапацкі [і інш]. – Мінск, 1996. – Ч. 1. – С. 130–137.

2. Канапацкі, І. Удзел татараў у Вялікай Айчыннай вайне на тэрыторыі Беларусі / І. Канапацкі // Народы СССР в годы Великой Отечественной войны 1941-1945 гг.(к 60-летию Победы советского народа в Великой Отечественной войне) : материалы XI междунар. науч.-практ. конф., Мінск, 30–31 мая 2005 г. / Бел. гос. пед. ун-т ; редкол.: З.И. Канапацкая [и др.]. – Минск, 2006. – С. 263–278.

3. Грыбава С. Уклад мінскіх татар у перамогу над ворагам у час Вялікай Айчыннай вайны / С. Грыбава // Актуальные проблемы истории советских Вооруженных сил и Вооруженных сил Республики Беларусь : науч. тр. / Брест. гос. техн. ун-т ; под ред. А.Н. Баюры. – Брест, 2008. – С. 18–25.

4. Постановление бюро Минского ГК КПБ от 26 октября 1983 г. о признании подпольной группы, рук. И.А. Адамович, действовавшей в г. Минске в 1941–1942 гг., и приложения к нему // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 1346. – Воп. 1. – Спр. 270.

5. Воспоминания Драгун Л.Д. об участии в деятельности Минского антифашистского подполья в 1941–1943 гг. (подлинник и копия) 1960 г. // НАРБ. – Фонд 1346. – Воп. 1. – Спр. 133.

6. Воспоминания Соловьянчик В.А. об участии в деятельности Военного Совета партизанского движения в 1941–1942 гг. (1959 г) // НАРБ. – Фонд 1346. – Воп. 1. – Спр. 122.

7. Подвиги их бессмертны / Институт истории партии при ЦК КПБ ; сост. Л.В. Аржаева, А.Б. Рогов. – Минск : Беларусь, 1978. – 383 с.

8. Справка Института истории партии при ЦК КПБ и Института истории АН БССР от 1 декабря 1959 г. «К вопросу о партийном подполье в годы ВОВ (июнь 1941 – июль 1944 гг.)» // НАРБ. – Фонд 1346. – Воп. 1. – Спр. 88.

9. Постановление бюро Минского горкома КПБ от 30 января 1985 г. о признании деятельности на минском кожевенном заводе «Большевик» подпольной патриотической группы в 1941–1944 гг. и приложения к нему // НАРБ. – Фонд 1346. – Воп. 1. – Спр. 282.

10. Мінскае антыфашысцкае падполле / Камітэт па архівах і справаводству РБ, Нацыянальны архіў РБ ; рэдкал.: Я.І. Бараноўскі, А.М. Літвін [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 1995. – 256 с.

11. Стенограммы заседаний комиссии ЦК КПБ об истории организации и деятельности Минского антифашистского подполья и его участниках. 1958 г. // НАРБ. – Фонд 1346. – Воп. 1. – Спр. 74.

12. Список связных разведывательно-диверсионной группы «Мстители», проводившей операции в 1943–1944 гг. в г. Минске и его окрестностях // НАРБ. – Фонд 1346. – Воп. 1. – Спр. 197.

13. Информация КГБ при СМ БССР от 30 июля 1980 г. о личном составе и деятельности связных разведывательно-диверсионной группы «Первые» в г. Минске // НАРБ. – Фонд 1346. – Воп. 1. – Спр. 195.

14. Отряд им. С.М. Кирова бригады им. С.М. Кирова, Минская обл. // НАРБ. – Фонд 1450. – Воп. 7. – Спр. 53.

15. Нікалайчык, Т.Я. Тое, што помніцца / Т.Я. Нікалайчык // Байрам. – 1994. – № 4. – С. 61–63.

16. Постановление парторганов о признании граждан участниками партизанского движения Беларуси в годы ВОВ и приложения к ним (справки, заявления, личные листки по учету партизанских кадров, характеристики, свидетельские показания, рапорта др.) 20 марта – 8 апреля 1980 г. // НАРБ. – Фонд 1450. – Воп. 5. – Спр. 743.

17. Документы о признании деятельности подпольной партийной организации КП(б)Б Узденского района (постановления, выписка из протокола, справка, информация, личные листки, фотографии, список). 1966-1969 гг. // НАРБ. – Фонд 1393. – Воп. 1. – Спр. 99.

18. Документы, на основании которых выданы партизанские справки и справки связных за 1947 г. (буквы А–И ) // НАРБ. – Фонд 1450. – Воп. 5. – Спр. 506.

19. Бригада им. К.Е. Ворошилова, Минская обл. // НАРБ. – Фонд 1450. – Воп. 5. – Спр. 151.

***Gribova S.* The Belarusian Tatars in Clandestine Activity During the Great Patriotic War in Belarus**

The article includes information about the activity of the Belarusian Tatars who were the part of clandestine organizations during the Great Patriotic War in Belarus. Most of the material is devoted to the struggle of local Tatars in Minsk clandestine organization which was the part of such organizations as “Mstiytsy”, “Pershiya”, the clandestine group of tannery “Balshavik”, the clandestine group that consisted of Tatar family the Adamovichy. The article reviews the activity of the Belarusian Tatars who were the part of the Uzda clandestine organization. The author draws attention to the fact that the article includes only the information about anti-fascist struggle of the Belarusian Tatars that was officially confirmed after the war. The material is mostly based on data of the National Archive of the Republic of Belarus and on memoirs of the participants of the Great Patriotic War. It is necessary to note the value of the gathered information – most of it is actualized and brought into scientific usage for the first time.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 17.11.08